# Калекцыя ад розных народаў

Адкрыццё выстаўкі "Дзівосны свет буквара" адбылося ў аддзеле мастацтваў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага. Сюды па запрашэнні музея Максіма Багдановіча прыехаў з Рыгі вядомы літоўскі калекцыянер Юрыс Цыбульс з мноствам буквароў і азбук розных народаў.



*Юрыс Цыбульс у Гродзенскай бібліятэцы.*

**Тамара МАЗУР,**
**фота Яраслава Ванюкевіча**

Юрыс Цыбульс мае 8 300 буквароў з 216 краін свету на 1030 мовах і гаворках. Яго калекцыя выстаўлялася ў школах, бібліятэках, клубах Латвіі больш як 170 разоў, была ўзнагароджана срэбраным медалём на ВДНГ у Маскве, пабывала ў Грэцыі і Расіі. У Беларусь частка гэтай калекцыі прывезена ўпершыню — у рамках дзяржаўнай праграмы культурнага супрацоўніцтва нашай краіны з Латвіяй.

Прыцягальная не толькі калекцыя буквароў Юрыса Цыбульса, але і яго асоба. Гэты чалавек — педагог па адукацыі, філолаг, выкладчык англійскай і нямецкай моў, журналіст, перакладчык. Ён жа з'яўляецца аўтарам буквара на латышскай мове, кнігі для чытання ў Пурлоўскай гаворцы латгальскай мовы і кнігі "Латгальскія буквары".

— На самай справе ад пачатку, з 1970 года, я збіраю мовы, а не буквары, — зазначыў спадар Цыбульс. — А калекцыя буквароў склалася таму, што іншым шляхам мовы з усяго свету не сабраць.

Пасля ўступу калекцыянер падышоў да школьнай дошкі, напісаў на ёй літару "А", якая ёсць ва ўсіх мовах, і правёў захапляльны ўрок пра тое, якая з моў самая багатая на гукі, якая — на літары, у якой ёсць толькі зычныя, а ў якой — толькі галосныя. З яго вуснаў можна было даведацца, як гучаць мовы, словы ў якіх прамаўляюцца толькі на выдыху альбо толькі на ўдыху; пра тое, што род у некаторых мовах можа быць не толькі мужчынскі, жаночы і ніякі, але і харчовы; што ёсць мовы, у якіх няма слоў "вайна", "салдат", "злодзей", бо там няма такіх паняццяў.

— Кожная мова — гэта чароўнае кола. І з яго няма выйсця, акрамя як перайсці ў іншае кола, — патлумачыў Юрыс Цыбульс. — Дзеля гэтага існуе граматыка. Яна патрэбная, каб вывучаць чужую мову, бо для роднай насамрэч дастаткова буквара.